эфектыўнымі, разнастайнымі і абавязкова прадугледжваць дыферэнцыраваны падыход з боку выкладчыкаў і кіраўнікоў баз практыкі пры іх здзяйсненні.

Асобую актуальнасць сёння набывае пастаяннае ўдасканаленне формаў кантролю за педагагічнай і творчай практыкай у залежнасці ад патрабаванняў часу.

**І.А.Дарохіна,**
**дырэктар дзіцячай харэаграфічнай школы г.Мінска**

## ПОШУК ШЛЯХОЎ ВЫКАНАННЯ СУМЕСНЫХ ТВОРЧЫХ ПРАЕКТАЎ ВУЧНЯЎ І СТУДЭНТАЎ

Вырашаць задачы падрыхтоўкі высокакваліфікаваных выкладчыкаў для Рэспублікі Беларусь можна з дапамогай творчага кантакту Беларускага універсітэта культуры і адзінай у г.Мінску дзіцячай харэаграфічнай школы.

Кантакт гэты трэба будаваць па законе творчасці, каштоўнасць яго бачыцца не ў выніку, не ў прадукце творчасці, а ў самім працэсе.

Асаблівасць дзейнасці дзіцячай харэаграфічнай школы (ДХШ) як базы практыкі ў наступным.

Па-першае, усе навучэнцы ДХШ з'яўляюцца вучнямі спецыяльна арганізаваных класаў базавых школ № 12, 83, 155, 209. Яны фарміруюцца выкладчыкамі харэаграфічнай школы шляхам праверкі здольнасцей, фізічных магчымасцей і творчага патэнцыялу дзяцей. Расклад заняткаў у іх складаецца з улікам занятасці у дзвюх школах, нават з вызваленнем ад дубліруючых прадметаў. Арганізаваны спецрэйсы прывозу вучняў на заняткі згодна раскладу школы, што дазваляе практыканту не звяртаць увагі на арганізацыйныя пытанні.

Па-другое, выкладчыкі, якія навучаюць харэаграфіі, фарміруюць асобу, развіваюць яе фізічна, эмацыянальна, музыкальна, інтэлектуальна. Усе набываемыя прафесійныя навыкі ў харэаграфіі і музыцы, усе свае магчымасці і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таленты вучні маюць магчымасць выкарыстоўваць і раскрываць у шматграннай вучэбнай, канцэртнай дзейнасці, у гадавых традыцыйных мерапрыемствах школы.

Практыканту даецца магчымасць пазнаёміцца з вучэбным працэсам, з традыцыямі школы, а потым прымаць удзел у творчых эксперыментах як у вучэбнай рабоце, так і ў стварэнні пастановачных харэаграфічных работ у розных жанрах. Задача базы практыкі — раскрыць суб'ектыўныя магчымасці і вопыт студэнта.

Практыкант не з'яўляецца прадуктам навучання. Ён перш за ўсё павінен імкнуцца да раскрыцця свайго прыроднага патэнцыялу, і трэба дапамагчы яму, прадаставіць адпаведныя для гэтага ўмовы .

Школа бачыць галоўныя задачы практыкантаў у наступным:

— пазнаёміць з вучэбна-педагагічнай і творчай сістэмай сваёй работы, з найбольш значнымі педагагічнымі тэхналогіямі ў практычнай дзейнасці.

— уключыць практыкантаў у сістэму інтэнсіўнага творчага росту;

— развіваць сатворчасць практыкантаў і вучняў.

Найбольш эфектыўнай формай з'яўляецца перагляд вучэбных праграм, увага да інтэграцыі шляхам стварэння аўтарскіх праграм. Інтэграцыя, стварэнне і напісанне новых праграм з улікам вопыту работы, музыкальныя нарыхтоўкі да заняткаў харэаграфіі не толькі эканомяць час, але і даюць комплекснае ўяўленне аб сферы мастацтва.

Да эфектыўных формаў работы школы адносіцца сістэма факультатыўных заняткаў (ПКН, музыкальны інструмент і інш.) і работа творчых майстэрань школы: узорны ансамбль танца "Весялушка", сучасная харэаграфія, бальны танец (па выбары вучня).

У школе ўсталявана сувязь вучэбнай работы з пазакласнай: бацькоўскія сходы, правядзенне традыцыйных для школы абрадаў, клас-паказаў, выязных канцэртаў, конкурсаў і іншых мерапрыемстваў.

Пры выкладанні неабходна добрае веданне традыцый, як станоўчых , так і адмоўных. Толькі спрабуючы ацаніць традыцыі, практыкант-настаўнік можа пабудаваць новы вопыт. Настаўніцкае самавыяўленне адбываецца заўсёды на аснове традыцый і глыбокага ведання гісторыі.

Сёння толькі добрае веданне зместу вучэбнага матэрыялу, тэорый і методык прадметаў харэаграфіі, узважванне іх вартасцей і недахопаў, паважлівыя адносіны да чужой пазіцыі дазваляе практыканту пабудаваць сваю, асабістую, педагагічную, творчую ці метадычную канцэпцыю.

У нашым настаўніцкім асяроддзі малады настаўнік мае магчымасць назіраць і ствараць сваё ў сферы музыкі і харэаграфіі.

Школа мэтанакіравана далучае практыканта да сваіх формаў работы.

Студэнт можа выбраць: узроставую катэгорыю (малодшыя класы і старэйшыя класы) і від харэаграфіі (класічны танец, народны танец, гісторыка-бытавы ці сучасны танец). Студэнту прапануецца наведаць заняткі ў школе вядучых настаўнікаў у класах рознага ўзросту. Практыкант атрымлівае магчымасць суаднесці выконваемы матэрыял на уроку з тым, што прапануецца ў вучэбных праграмах. Для развіцця творчай ініцыятывы студэнту можа быць прапанавана самастойна правесці ўвесь урок ці частку ўрока.

Яму ставяцца задачы:

— развіць цікавасць у вучняў да заняткаў харэаграфіяй;

— фарміраваць прафесійныя навыкі ў навучэнцаў з улікам фізічных індывідуальных здольнасцей вучняў.

Практыкант з першых заняткаў сутыкаецца з розным успрыняццем вучнямі матэрыялу урока з прычыны розных адносін да вучобы і вырашае праблемы індывідуальнай і калектыўнай работы са школьнікамі. З дзецьмі важна на занятках абменьвацца ўражаннямі, засяроджваючы іх увагу на неабходных дэталях і сцэнах. Вучні заўсёды імкнуцца захаваць у памяці тое, што яны пачулі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ад студэнта-практыканта на ўроку харэаграфіі патрэбна апісанне вобраза словам, тады для вучня заданне становіцца канкрэтным і запамінаецца.

Вельмі важна, каб студэнты-практыканты адчувалі сябе ўдзельнікамі падзей на ўроку, глыбей разумелі індывідуальнасць вучня.

Сведчаннем іх паразумення з'яўляецца творчая работа студэнтаў на занятках. Студэнт павінен "адчуваць" заданне, якое выконвае вучань.

Неабходна пашыраць вопыт студэнта, калі жадаем ствараць асновы для яго творчай дзейнасці. Чым больш студэнт бачыў, чуў і перажыў, чым больш ён ведае і засвоіў, тым значней і прадуктыўней будзе дзейнасць яго ў далучэнні вучняў да працэсу сатворчасці. Таму кожны са студэнтаў прапаноўвае вучням асабістае вобразнае асэнсаванне музычных твораў.

Галоўная задача для практыканта — прымаць удзел у сатворчасці з вучнямі, "растварыцца" ў свеце музыкі, уражанні аб вобразе зрабіць сваімі.

І тады можа узнікнуць новая задача яго як настаўніка для вучняў: выкласці па памяці рухам самую цікавую сітуацыю, выпадак, што запалі глыбока ў душу. Задача навучыцца бачыць не толькі навакольнае асяроддзе , але і адзін аднаго: калегу па класу, суседа па парце. Тут галоўнае сутыкнуцца з тэмай бачыць, слухаць, адчуваць і будаваць даказальна самастойна сваю думку.

Практыканту можа быць прапанавана набываць педагагічныя навыкі зносін з бацькамі сваіх вучняў у формах:

1) правядзення клас-паказу для бацькоў з наступным разборам поспехаў вучняў;

2) арганізацыі кантрольных урокаў у прысутнасці бацькоў з падрабязным аналізам і выстаўленнем адзнак;

3) прыцягнення бацькоў да правядзення традыцыйных мерапрыемстваў: абрадаў-прысвячэнняў у харэографы, аб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

радаў уручэння дыпломаў, конкурсаў, творчых работ вучняў, вечарын пытанняў, канцэртаў і інш.

У канцы чвэрці ці вучэбнага года практыкант можа захаваць пройдзены матэрыял, адлюстроўваючы па-свойму яго для бацькоў.

Для таго каб стварыць свабоднага чалавека, чалавека-настаўніка, напэўна, трэба прызнаць практыканта адной з дзеючых фігур вучэбнага працэсу, а значыць, ён павінен выпрацаваць такія педагагічныя тэхналогіі, мэтай якіх на ўсіх этапах навучання з'яўляюцца не толькі сабраныя веды, але і пастаяннае ўзбагачэнне вопытам творчасці, фарміраванне механізму самарэалізацыі.

Акрамя канкрэтнай практыкі па азнаямленні з прафесіямі (выкладчык харэаграфіі; выкладчык-выхавацель; выкладчык-арганізатар) практыкант далучаецца да работы супрацоўніцтва з вучнямі, гэта значыць яму прапануецца форма падрыхтоўкі самастойнай творчай харэаграфічнай работы па вобразным чытанні музычнага твора. Гэта можа быць работа практыканта-кансультанта, практыканта-рэпетытара, практыканта-балетмайстра.

Акрамя самастойнай работы, студэнту-практыканту можа быць прапанавана напісанне сцэнарыяў ці сцэнарных планаў розных традыцыйных мерапрыемстваў.

У сістэме педагагічнай дзейнасці культура займае асобнае месца. Яна накіроўвае характар і змест пазнавальнага працэсу настаўніка, стымулюе яго працу, аб'ядноўвае асобу настаўніка з асобай вучня. Працэс гэты ў педагагічнай дзейнасці садзейнічае дыялогу: "адкрыць" як настаўніка для зносін з вучнем, так і вучня для зносін з настаўнікам. Фарміруецца сувязь як ад настаўніка да вучня, так і зваротная — ад вучня да настаўніка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ